**Сяргей Уладзіміравіч Федаровіч (1939-2019), вучоны ў галіне алергалогіі, імуналогіі, прафпаталогіі, заслужаны дзеяч Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002)**



Сяргей Уладзіміравіч Федаровіч нарадзіўся 22 мая 1939 года ў вёсцы Малыя Дворцы Пінскага павета (цяпер Пінскага раёна Брэсцкай вобласці). Вышэйшую адукацыю атрымаў у Ленінградскім санітарна-гігіенічным медыцынскім інстытуце, які скончыў у 1967 годзе. З 1968 года працаваў навуковым супрацоўнікам у аддзеле прафпаталогіі Беларускага навукова-даследчага скурна-венералагічнага інстытута, дзе ў 1973 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Фізіка-хімічныя паказчыкі скуры і імуналагічныя характарыстыкі хворых алергічнымі дэрматозамі».

У 1975 годзе Сяргей Уладзіміравіч быў выбраны на пасаду асістэнта, а ў 1988 годзе – дацэнта кафедры прафпаталогіі Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў. У 1986 годзе абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Эпідэміялогія, патагенез, клініка, дыягностыка, лячэнне і прафілактыка лекавай алергіі».

У 1988 годзе С. У. Федаровіча назначылі галоўным алерголагам Мінздрава; выбралі на пасаду дацэнта кафедры прафпаталогіі БелМАПО, у 1989 годзе – загадчыкам кафедры медыцыны і гігіены Беларускага інстытута фізічнай культуры. У 1990 годзе – зацверджаны ў званні прафесара.

Сяргей Уладзіміравіч ставіў пытанне стварэння ў ГУ «ІРНПЦ гігіены» клінічнай лабараторыі прафпаталогіі, і з 1993 года С. У. Федаровіч кіруе клінічным аддзелам прафпаталогіі і алергалогіі ГУ «Рэспубліканскі цэнтр гігіены». У 1996 годзе Сяргею Уладзіміравічу прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

С. У. Федаровіч з’яўляўся кіраўніком навукова-даследчых работ, а таксама Грантаў Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. Вынікі навукова-даследчых работ укаранёны ў практыку аховы здароўя са значным сацыяльным і эканамічным эфектам. Таксама ён з’яўляўся кансультантам трох Рэспубліканскіх цэнтраў (алергалогіі, прафпаталогіі і дэрмата-венералогіі) і кансультантам Рэспубліканскай станцыі санітарнай авіяцыі. На працягу амаль 50-ці гадоў аказваў пастаянную лячэбную, кансультатыўную і арганізацыйна-метадычную дапамогу хворым па ўсёй краіне.

Сяргей Уладзіміравіч з’яўляўся кіраўніком Рэспубліканскага цэнтра пабочнага дзеяння лекаў, Старшынёй Рэспубліканскага навуковага таварыства імунолагаў. С. У. Федаровіч быў выбраны ў склад праўлення навуковага таварыства алерголагаў і імунолагаў краін СНД, уваходзіў у склад Прэзідыума Міжнароднага таварыства алерголагаў і імунолагаў, з’яўляўся старшынёй секцыі па гігіене працы і прафпаталогіі праблемнай Камісіі

Мінздрава Рэспублікі Беларусь, членам Вучонага савета РНПЦ гігіены і спецыялізаваных саветаў БДМУ і ГУ «ІРНПЦ гігіены» па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Быў членам рэдакцыйнай калегіі часопісаў «Экалогія і здароўе», «Імуналогія».

Пад кіраўніцтвам С. У. Федаровіча ў краіне распрацавана і ўкаранёна тэхналогія спелеалячэння, якая не мае аналагаў у свеце. У Салігорску, на ПА «Беларуськалій», створана падземная рэспубліканская бальніца. 95% хворых, якія прайшлі лячэнне, адчуваюць сябе пасля «падземкі» вылечанымі. У ходзе даследаванняў раслінных алергенаў, праведзеных клінічным аддзелам прафпаталогіі і алергалогіі РНПЦ распрацаваны і ўкаранёны метад спецыфічнай імунатэрапіі. Айчынная імунаферментная тэст-сістэма замяніла імпартную, пасля якой дыягностыка туберкулёзу стала танней у 8 разоў.

Дзякуючы новым тэхналогіям на Мінскім трактарным заводзе зменшылася прафзахворвальнасць. Упершыню даследавана прафесійная алергія на Аршанскім ільнокамбінаце; прапанаваны і прыменены арыгінальныя прэпараты. Шматпланавыя навуковыя распрацоўкі дазволілі знізіць захворвальнасць на Мазырскім нафтаперапрацоўчым, полацкім заводзе «Шкловалакно», Магілёўскім ПА «Хімвалакно», Гродзенскім ПА «Азот». Прапанаваны і ўкаранёны ахоўны крэм Фёдаровіча для прафілактыкі алергіі.

Пад кіраўніцтвам С. У. Федаровіча падрыхтаваны 22 кандыдаты і адзін доктар медыцынскіх навук.

С. У. Федаровіч – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і двойчы прэміі НАН Беларусі, узнагароджаны дыпломам «Лепшы вынаходнік Мінскай вобласці», Дыпломам і медалём III Міжнароднай выстаўкі-кірмашу новых тэхналогій, абсталявання, спосабаў лячэння «Свет вынаходстваў і арыгінальных ідэй» у г. Сочы (2003).

Прафесар С. У. Фёдаравіч з'яўляецца аўтарам больш за 500 навуковых работ, у тым ліку 34 манаграфій, 28 метадычных рэкамендацый, 6 інструкцый, болей 100 вынаходстваў і рацпрапаноў. У 2002 годзе Сяргею Уладзіміравічу Федаровічу было прысвоена званне Ганаровага грамадзяніна Пінскага раёна.

3 верасня 2019 года Федаровіч Сяргей Уладзіміравіч пайшоў з жыцця.

## Працы С. У. Федаровіча


1. **Скепьян, Н. А.** Аллергические болезни / Н. А. Скепьян, С. В. Федорович // Справочник участкового терапевта / под ред. Г. П. Матвейкова. Мінск : Беларусь, 1986. С. 238–250.
2. **Федорович, С. В.** Лекарственная аллергия в клинической практике / С. В. Федорович. Минск, 1991. 72 с.
3. **Судебно-медицинские** аспекты лекарственной аллергии / С. В. Федорович. Минск : Полымя, 1992. 102 с.

4. **Лекарственная** аллергия в клинической практике / С. В. Федорович. Минск : Полымя, 1993. 63 с.
5. **Допинги** и аллергия / С. В. Федорович. Минск : Белорус. изд-во «Хата», 1994. 79 с.
6. **Лекарственная** аллергия у медицинских работников и рабочих заводов медпрепаратов / С. В. Федорович. Минск : Белорус. изд-во «Хата», 1994. 135 с.
7. **Повышенная** радиация и физическая культура / [В. А. Соколов, А. Г. Фурманов, С. В. Федорович и др. ; предисл. Е. Ф. Конопли]. Б. м., 1997. 254 с.
8. **Аллергические** дерматозы / С. В. Федорович. Минск, 1997. 86 с.
9. **Профессиональные** болезни кожи / С. В. Федорович. Минск : Полымя, 1997. 211 с.
10. **Профессиональные** аллергозы / Бел. науч.-исслед. санитар.-гигиен. ин-т, Лаб. клин. профподгот. БелНИСГИ ; [С. В. Федорович, В. П. Филонов, С. М. Соколов]. Барановичи : Укрупн. тип., 1998. 98 с.
11. **Экологическая** аллергология и иммунология / С. В. Федорович. Минск : Типография МТЗ, 2003. 85 с.
12. **Профессиональный** бронхит / С. В. Федорович. Барановичи : РУПП «Баранов. укрупн. тип.», 2003. 257 с.
13. **Пищевая** аллергия / С. В. Федорович, В. А. Жарин. Минск : Харвест, 2007. 350 с.
14. **Труд** и здоровье медицинских работников / С. В. Федорович [и др.] ; Министерство здравоохранения Республики Беларусь [и др.]. Минск : Кнігазбор, 2010. 131 с.

**Аб жыцці і дзейнасці С. У. Федаровіча**

1. **Федорович Сергей Владимирович** // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. Минск, 2008. Т. 7. С. 354.
2. **Федорович Сергей Владимирович** // Учёные Пинщины : [справ. издание] / авт.-сост. И. А. Кибак, П. Н. Синкевич, В. В. Василевицкий. Пинск : Пин. регион. тип., 2012. С. 123–124.
3. **Федорович Сергей Владимирович** // Кто есть Кто в Республике Беларусь. 2004 / под ред. И. В. Чекалова. Минск : Энциклопедикс, 2004. С. 285–286.
4. **Федаровіч Сяргей Уладзіміравіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 2003. Т. 16. С. 342.
5. **Федаровіч Сяргей Уладзіміравіч** // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003. С. 485.
6. **О присуждении** Государственных премий Республики Беларусь 2002 года : Указ Президента Республики Беларусь от 23 апреля 2003 г. № 170 // Зарег. в Нац. реестре правовых актов Республики Беларусь, 2003 г. № 50. 1/4562.
7. **О присвоении** С. В. Федоровичу почетного звания «Заслуженный деятель науки Республики Беларусь» : Указ Президента Республики

Беларусь от 16 декабря 1996 г. № 552 // Собрание декретов, указов Президента и постановлений Правительства Республики Беларусь, 1996 г. № 35. ст. 940.

8. **Почетные** граждане Пинского района // Полесская правда, Пинск. 2020. 17 января (№ 5). С. 3.
9. **Федорович Сергей Владимирович** : некролог // Полесская правда, Пинск. 2019. 4 сентября (№ 72). С.8.
10. **Почетные** граждане Пинского района // Полесская правда, Пинск. 2015. 16. января.
11. **Сергей Владимирович Федорович** : к 75-летию со дня рождения // Здравоохранение. 2014. № 5. С. 70–71.
12. **Николаева, В.** Быть добру! : [Почетный гражданин Пинского района С. В. Федорович] / Вероника Николаева // Полесская правда, Пинск. 2010. 25 сентября.
13. **Екель, Л.** Защита Федоровича : в небольшой деревеньке под Пинском родился известный ученый в области иммунологии / Леонид Екель // Вечерний Брест. 2010. 13 авг. С. 4.
14. **Яковлева, Л. Ф.** К 70-летию доктора медицинских наук, профессора Федоровича Сергея Владимировича / Л. Ф. Яковлева, Р. Н. Пилькевич, И. В. Кистень // Изобретатель. 2009. № 10. С. 17–20.
15. **Шестакова, Н.** С заботой о земляках : [в Днях науки Пинщины принял участие доктор медицинских наук, профессор С. В. Федорович] / Наталья Шестакова // Полесская правда, Пинск. 2006. 20 мая.
16. **Кирковец, Н.** А за плечами всего… 65! : [заслуженный деятель науки Республики Беларусь, земляк С. В. Федорович] / Наталья Кирковец // Пінскі веснік. 2004. 21 мая.
17. **О присвоении** звания «Почетный гражданин Пинского района» Федоровичу Сергею Владимировичу : Решение Пинского районного Совета депутатов № 02-06 от 17.06.2003 г. // Полесская правда, Пинск. 2003. 25 июня.
18. **Шестакова, Н.** Наш земляк – лауреат Государственной премии [С. В. Федорович, доктор медицинских наук] / Наталья Шестакова // Полесская правда, Пинск. 2003. 24 мая.
19. **Шестакова, Н.** Подарок коллегам. Недавно в очередной раз на родной Пинщине побывал доктор медицинских наук, профессор С. В. Федорович / Наталья Шестакова // Полесская правда, Пинск. 2002. 15 июня.
20. **Шапиро, С.** Покой только снится : [60-летие ученого-медика С. В. Федоровича] / Семен Шапиро // Полесская правда, Пинск. 1999. 16 июня.
21. **Солнечный** человек: [Сергей Владимирович Федорович] //http://gthice.clan.su/news/solnechnyj_chelovek/2014-01-17-154.
22. **Федорович Сергей Владимирович** // http://doktora.by/otzyvy/allergolog-v-minske-fedorovich-sergey-vladimirovich.

23. **Заведующий** клиническим отделом профпатологии – Федорович Сергей Владимирович, доктор биологических наук, доктор медицинских наук, профессор. – Режим доступа: // http://minzdrav.gov.by/export/content /RUSSIAN/RNPC /GIGIENA/gig_r.htm.